человеком и сплачивал вокруг себя коллектив, решавший многие и сложные задачи.

Невозможно в одной статье описать всю плодотворную деятельность такого человека. Но очевидно то, что его жизнь, его дела могут быть примером для подрастающего поколения, его научные работы требуют дальнейшего изучения, а педагогический опыт – обобщения и внедрения. Мнения авторов публикаций поддерживают его соратники, коллеги, ученики.

## ТЭАТРАЛЬНЫЯ ЗБУДАВАННІ МІНСКА XVIII – XIX СТСТ.

**Пагоцкая А. В.**
*выкладчык кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры*
*УА "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"*
*(Рэспубліка Беларусь, г. Мінск)*

Гісторыя тэатральнага жыцця Мінска ўжо даволі поўна асветлена ў работах беларускіх тэатразнаўцаў, але, на жаль, аб архітэктуры тэатральных будынкаў і нават аб іх тапаграфіі было сказана вельмі мала. А ўведзеныя ў навуковы ўжытак звесткі пра асобныя памяшканні, дзе праходзілі спектаклі, і іх уладальніках, на жаль, не заўсёды дакладныя. Справа ў тым, што на працягу кароткага прамежку часу мяняліся і адрасы тэатральных будынкаў, і самі іх уладальнікі.

Найбольш старажытным збудаваннем, звязаным з гісторыяй тэатра ў Мінску, з'яўляецца школа калегіума езуітаў (цяпер перабудаванае памяшканне музычнай школы на плошчы Свабоды, 7), дзе яшчэ ў XVII–XVIII стст. праходзілі пастаноўкі школьнай драмы. Першыя прадстаўленні на гэтай сцэне датуюцца 1698 годам: тады былі пастаўлены дыялогі на заканчэнне вучэбнага года. Публічныя выступленні школьнага тэатра пачынаюцца з 1690 г. Захаваліся назвы шэрагу лацінскіх драм, пастаўленых у Мінску. Гэта "Ахвяра любові" (1698), "Росквіт царства" (1713), "Свяшчэнны саюз Мінервы і Марса" (1727) і інш.

Звесткі аб з'яўленні ў Мінску тэатра прафесіянальнага тыпу адносяцца да другой паловы XVIII стагоддзя. Тады пачаліся рэгулярныя наведванні горада вандроўнымі трупамі з Вільні і Варшавы. У 1787 г. Д. Мараўскім, а ў 1788 г. К. Жулкеўскім былі зроблены спробы сфарміраваць пастаянную тэатральную трупу для горада, але яны закончыліся няўдачай. І пачатак дзейнасці першага "Мінскага тэатра" трэба адносіць да 1790 года. Гэта падзея звязана з імем вядомага рэжысёра і акцёра А.-Ш. Жукоўскага. Сфарміраваная ім трупа на працягу трох гадоў дае прадстаўленні ў горадзе. Гэтыя пастаноўкі маглі ўбачыць свет толькі ў двух будынках – у школе былога калегіума езуітаў або зале ратушы, якая знаходзілася таксама на плошчы Высокага рынку. Іншых памяшканняў, прыдатных для тэатральных прадстаўленняў, у Мінску таго часу не было.

З 1797 па 1805 гады з невялікімі перапынкамі ў горадзе працуе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

антрэпрыза пад кіраўніцтвам таленавітага артыста і рэжысёра Мацея Кажынскага. Тэатр М. Кажынскага карыстаўся вялікай папулярнасцю, і прадстаўленні, як правіла, праходзілі пры перапоўненых залах, якія іншы раз нават не ўмяшчалі ўсіх жадаючых. Для спектакляў патрабавалася больш прасторнае памяшканне са сцэнай, прыстасаванай для ўстаноўкі куліс і дэкарацый – тэларый. Ім стала спецыяльная зала, абсталяваная ў бакавым двухпавярховым флігелі Мінскай гімназіі, пабудаваным у 1801 г. У рэвізіі гімназіі за 1803 г. гэта зала ўпамінаецца як "Гарадскі прыватны тэатр". На плане гімназіі пачатку XIX ст. тэатральная зала размяшчалася на другім паверсе правага крыла будынка (зараз частка сучаснага Дома прафсаюзаў, плошча Свабоды, 23, што выходзіць на вуліцу Інтэрнацыянальную).

У 1846 г. акцёр Вяржбіцкі стварыў у Мінску артыстычную трупу. Менавіта яна з'явілася першаасновай сталага Мінскага гарадскога тэатра. Была сфарміравана спецыяльная, зацверджаная губернатарам камісія, якая ажыццяўляла пастаянны кантроль за тэатральнай дзейнасцю ў Мінску. Тэатр зрабіўся неад'емнай часткай гарадской культуры. З'явілася мноства антрэпрэнёраў і перасоўных труп, што выступалі на розных сцэнах, у розных залах горада.

Будынак гарадскога тэатра знаходзіўся на Саборнай плошчы (там да 1984 года яшчэ стаяў дом № 28 па Інтэрнацыянальнай вуліцы). Паводле дакументаў, у 1826 годзе пад тэатр перабудаваў свой уласны дом тутэйшы дваранін Ян Байкоў. Глядзельная зала размяшчалася на другім паверсе. Праўда, спектаклі даваліся тут вельмі нерэгулярна. У 1847–1851 гг. яны збіралі гледачоў у ратушным тэатры, у 1864–1877 гг. – у зале дваранскага сходу. У 1884 годзе гарадскі тэатр згарэў. Адсутнасць свайго памяшкання стварала шэраг нязручнасцей, не дазваляла трымаць добрыя дэкарацыі, мець касцюмерныя, праводзіць рэпетыцыі.

Ініцыятарам узвядзення новага будынка тэатра выступіў губернатар князь М.М. Трубяцкі. Месцам для будынка быў выбраны Аляксандраўскі сквер. Будаўніцтва распачалося ў чэрвені 1888 года. Архітэктарам стаў Караль Казлоўскі – выпускнік пецярбургскай акадэміі мастацтваў, які перад тым збудаваў тэатр у Любліне, а пазней будынак варшаўскай філармоніі і тэатр у Коўне.

Тэатр меў трох'ярусную ў разрэзе, з амфітэатрам, падковападобную форму залы. Партэр, ложы першага ярусу і бельэтаж прызначаліся, як звычайна, для заможнай публікі. Балкон узнімаўся прыступкамі ўгору, каб лепей было відаць сцэну. Асобныя ложы былі спраектаваны для дырэктара і губернатара па абодва бакі партэра побач са сцэнай. Насупраць сцэны на другім ярусе балкона знаходзілася "царская ложа". У Мінскім тэатры перакрыцці ложаў трымаліся кансольна на рэйках, і гэта было на той час значнае канструкцыйна-тэхнічнае дасягненне.

Габарыты сцэны (глыбіня – 10,6 м, шырыня – 14,9 м, вышыня – 17 м) дазвалялі падымаць дэкарацыі і заслону. Заслону для сцэны выканалі маладыя майстры-дэкаратары Ю. Рэйнберг і Г. Веніг. Да сцэны прымыкаў двухпавярховы аб'ём з артыстычнымі пакоямі спецыяльнага прызначэння.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сцэнічная пляцоўка адкрывалася вялікім праёмам – партальнай аркай. Большая частка аркестра знаходзілася пад сцэнай, а ў залу выступала аркестравая яма. Галоўны цэнтральны праход ішоў уздоўж восі глядзельнай залы; былі і дадатковыя выхады па баках. Падлога ў зале магла падымацца дамкратамі да ўзроўню сцэны, і тэатральная зала даўжынёю 24,14 м рабілася месцам для баляў і маскарадаў.

У тэатры былі дапаможныя памяшканні: касавая зала, вестыбюль, лесвіцы, калідоры, кулуары, фае, гасціныя, курыльныя пакоі, буфет, а таксама адміністрацыйныя і службовыя памяшканні. Планы не прадугледжвалі асобных месцаў для гардэроба, і гледачы пакідалі вопратку ў калідорах, якія размяшчаліся па перыметры залы, на ўсіх ярусах. З калідора другога паверха траплялі ў шыкоўна аформленае фае, дзе быў буфет; у антрактах тут іграла музыка і публіка танцавала.

Разлічаная на 550 месцаў зала (пазней павялічана да 700) была багата аздоблена ляпнінай і роспісамі. Ляпной работы партал над сцэнай завяршаўся гербам Мінскай губерніі. У зале віселі партрэты А. Пушкіна, М. Гогаля, М. Глінкі і А. Астроўскага. Тэатр урачыста адкрыўся 5 чэрвеня 1890 года аматарскім спектаклем “Сфінкс” О. Фелье.

Рэзкім кантрастам выдатнаму будынку зімняга тэатра з’яўляўся летні тэатр. Узведзены ў 1880 годзе ў гарадскім садзе, ён к канцу стагоддзя стаў такім трухлявым, што антрэпрэнёры адмаўляліся браць тэатр у арэнду. Становішча “выратаваў” моцны пажар, пасля якога ад тэатра засталося адно папялішча. На сабраныя па падпісцы грошы А.Дэвіньe ў 1913 годзе пабудаваў новы тэатр.

Паступова на працягу XX ст. гарадскі тэатр Мінска згубіў сваё гістарычнае аблічча. Але ў 2010–2012 гг. адбылася рэканструкцыя будынка. Тэатру вярнулі яго першапачатковы выгляд. Напрыклад, з другога паверха фасада знялі нарошчаныя ў 1960-я гады канструкцыі, аднавілі ляпніну і аркі. Інтэр’ер тэатра таксама змяніўся. Былі ўзноўлены дэтальна ўнутраны дэкор у бірузова-блакітным колеры, ляпніна, дзверы, мэбля, каміны. Зноў з’явілася фае для гледачоў, якое падчас рэканструкцый у сярэдзіне XX ст. было заменена рэпетыцыйнай залай, кабінетамі адміністрацыі, архівамі. Яно вядзе да ложаў. Усе ложы паміж сабой падзелены сценкамі, яны аддзяляюць гледачоў так, як гэта было ў імперскіх тэатрах.

У галоўнай зале палепшылася бачнасць з глядацкіх месцаў, колькасць месцаў паменшылася, але якасць гэтых месцаў стала лепшай, яны ўзняліся на прыступкі. На вялікі жаль, не атрымалася аднавіць магчымасць пад’ёму падлогі глядзельнай залы. Гэта функцыя была ўнікальнай для тэатра і ўвогуле, для Беларусі. Не прышлося аднаўляць і сістэму паваротнага кола на сцэне. На месца механізмаў, якія даўно састарэлі, прыйшлі новыя тэхналогіі: люкі-правалы, праз якія артысты з’яўляцца і знікаюць, пляцоўкі на радыёкіраванні, якія рухаюцца па сцэне і ствараюць любую кампазіцыю.

У розныя гады Мінскі гарадскі тэатр прымаў гастралёраў, кожны раз гэта былі розныя па ўзроўні калектывы, якія неаднолькава прымаліся публікай. Мінск наведвалі рускія, украінскія, польскія антрэпрызы, трупы Александрынскага і маскоўскага Малога тэатра. Такім чынам, гісторыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэатральнага жыцця Мінска XVIII–XIX стст. дазваляе сцвярджаць, што працэсы, якія адбываліся ў культуры і мастацтве горада, сталі грунтоўнай базай для развіцця і станаўлення сучаснага тэатра.

1. Дзянісаў, У. Старэйшая тэатральная зала Мінска / У. Дзянісаў // Мінск Тэатральны. Красавік – жнівень, 1981. – С. 43–44.

2. Чарнатаў, В. М. Архітэктура тэатраў / В.М. Чарнатаў // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1973. – № 1. – С. 28–31.

3. Шыбека, З. В. Мінск: Старонкі жыцця дарэвалюцыйнага горада / З.В. Шыбека, С.Ф. Шыбека / пер. з рус. мовы М. Віжа; прадм. С.М. Станюты. – Мінск : Полымя, 1994. – 341 с.: іл.

## ЖАНРОВЫЕ ОСОБЕННОСТИ ЭКРАНИЗАЦИЙ ВИДЕОИГР

**Пармон А. И.,** *студентка 4 курса*
*Научный руководитель – Шаройко Е. Н., кандидат искусствоведения,*
*доцент кафедры белорусской и мировой художественной культуры*
*УО «Белорусский государственный университет культуры и искусств»*
*(Республика Беларусь, г. Минск)*

За сравнительно короткую историю видеоигр (с 1980-х гг.), большинство наиболее значимых из них хотя бы один раз подвергалось экранизациям – будь то анимационные или игровые фильмы, многосерийные телевизионные фильмы.

Видеоигра представляет собой фактически готовый режиссерский сценарий для фильма жанра экшн. Общий стиль экранизации чаще всего соответствует стилю наиболее актуальных объектов игровой индустрии того времени, когда снимается фильм, за исключением «перезагрузок» (т. е. создания нового сюжета) значимых серий видеоигр [4]. Обращение к популярной видеоигре как основе фильма заранее может обеспечить успех будущей киноленте. Она привлечет внимание игроков, которые смогут вновь пережить перипетии знакомой игры.

С начала 1990-х гг. зарубежные кинорежиссеры начали обращаться к видеоиграм как источнику экранизаций. Это, например, фильмы *«Super Mario Bros.»* (1993 г., режиссеров Р. Мортона и А. Янкеля; по мотивам одноименной игры 1985 г. компании «Nintendo»), *«DOA: Dead or Alive»* (2007 г., режиссера К. Юэня, по мотивам серии видеоигр компании «Tecmo») и другие. В основу сюжета этих киноработ положены игры жанра «файтинг» (от англ. fighting – бой, поединок, борьба) – аркадного жанра, подразумевающего собой наличие большого количества рукопашных боев [5]. Подобные экранизации представляют собой приключенческие фильмы в духе азиатских кинолент о боевых искусствах. В них уделяется большое внимание хореографии и постановке боев, из-за чего драматическая составляющая общей концепции игры часто выглядит клишированной. Дополнительные возможности при переносе легенды игрового мира в кино дает и другая составляющих файтингов

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ